г. Вілейка,
вуліца Чапаева – 65,
тэл. 5-75-47

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Вілейская гімназія № 2”**



# Вілейская Свята-Ціханаўская праваслаўная царква

гістарычны буклет

***падрыхтаваны вучнямі 9 класа
пад кіраўніцтвам М.М. Іваненкі***

**2022 год**

# Свята-Ціханаўская царква



6 мая 1994 года дырэктар малога прадпрыемства “Эльбрус”, а зараз благачынны Мядзельскай акругі пратаіярэй Ігар Міхайлавіч Шалуха атрымаў благаславенне Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі на будаўніцтва ў Вілейцы новага праваслаўнага храма ў імя Свяціцеля Ціхана - Патрыярха Усерасійскага.

Імя гэтага святога было абрана невыпадкова. Свяціцель Ціхан больш за тры гады служыў мітрапалітам Літоўскай епархіі, у склад якой ўваходзіла тады і Вілейка. Пад час сваіх паездак па епархіі ён часта наведваў Вілейшчыну і таму мы праслаўляем яго як мясцовага іспаведніка.

30 чэрвеня 1994 года, пад час свайго архіпастырскага візіту ў Вілейку, уладыка Філарэт асвяціў месца пад будаўніцтва новай царквы. Настаяцелем быў прызначаны святар Фёдар Кукс, які служыць і да гэтага часу ў сане протаіярэя.



Праект новага храма выканаў вопытны архітэктар Мікалай Іосіфавіч Лук’янчык. За 1995 год намаганнямі старасты прыхода Ігара Міхайлавіча Шалухі і прыхажаніна Валерыя Еўдакімавіча Новікава, якія ахвяравалі на будаўніцтва значную частку асабістых сродкаў, з дапамогай актыўных вернікаў былі ўзведзены сцены, падрыхтавана памяшканне цокальнага паверха для правядзення набажэнстваў, арганізаваны царкоўны хор.

9 кастрычніка 1995 года іярэем Федарам Куксам была праведзена першая літургія.

Крыху пазней Брэсцкі краязнаўчы музей перадаў настаяцелю храма каля 30 старадаўніх ікон прыкладна 18-19 стагоддзяў, канфіскаваных пры спробе перавозу праз мяжу.



9 кастрычніка 1997 года, у дзень памяці Свяціцеля Ціхана, храм быў асвечаны. Урачыстае набажэнства правёў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт.

Летам 1998 года над алтарнай часткай з’явілася першая фрэска, выява Святой Тройцы – праца іканапісца Андрэя Косінава. Трох’ярусны іканастас, увенчаны крыжам, зроблены ў традыцыях старадаўняга рускага іканапісу. Іконы верхняга раду напісаў мастак – іканапісец Барыс Цытовіч; ніжні рад ікон напісаў Андрэй Косінаў, сярэдні рад, або “Святочны чын”, выканала Вольга Рыбіна. Яна на фотаздымку з іконай святочнага чыну “Благавешчанне Прэсвятой Багародзіцы”

Зараз у храме зберагаюцца вялікія святыні: ікона Свяціцеля Ціхана з часцінкай яго Святых Мошчаў і машчавік са Святымі Мошчамі дванаццаці Опцінскіх старцаў – благаславенне Опцінай Пустыні.



З канца 2003 года вядзецца праца па аздабленню храма насценнымі роспісамі. Яго ажыццяўлялі вопытныя мастакі: Барыс Цытовіч і Аляксей Дзмітрыеў, дапамагаў ім прыхажанін Аляксандр Астрэлін.